УДК 373.3.03:792

***Ю.У. Мянькоў***
(ДУА «Ільічоўская сярэдняя школа»)

# ТЭАТР ЯК СРОДАК ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА І ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

*У артыкуле разгледжаны магчымасці тэатралізаванай дзейнасці ў духоўна-маральным і эстэтычным выхаванні малодшых школьнікаў. Раскрываюцца змест і формы тэатралізаванай дзейнасці, прыводзіцца інфармацыя пра тое, якія якасці асобы тэатр развівае ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту.*

Тэатралізаваная дзейнасць вызначаецца спецыфічнай асаблівасцю: яна аб'ядноўвае ў сабе розныя віды мастацтва. Ажыццяўленне тэатралізаванай дзейнасці з'яўляецца яркім прыкладам рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыі. У розныя гістарычныя перыяды вядомыя філосафы, педагогі, мастацтвазнаўцы, паэты (Платон, Т. Гобс, Р. Тагор, В. А. Сухамлінскі, Ф. М. Дастаеўскі, Якуб Колас, Максім Багдановіч, А. Разанаў і інш.) высока ацэньвалі вялікае ўздзеянне прыгожага на фарміраванне глыбока думаючай, усебакова развітай асобы. Навукоўцы і літаратары адзначалі пры гэтым важнасць эстэтычнага выхавання. Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі было выказана меркаванне, што Прыгажосць, Мера, Гармонія – гэта не толькі эталоны якіх-небудзь твораў мастацтва ці з'яў прыроды, але і прынцыпы грамадскага жыцця.

Тэатральнае мастацтва, разам з іншымі відамі мастацтва, уяўляе сабою адну з формаў грамадскай свядомасці. Першаснае значэнне ў жыцці грамадства тэатр займае ў якасці спосабу мастацкага адлюстравання рэчаіснасці і эстэтычнага выхавання мас. Тэатр і яго гістарычнае развіццё нельга аддзяліць ад развіцця грамадства, а таксама ад стану культуры ў цэлым. Тэатр заўсёды быў, ёсць і будзе папулярным відам мастацтва сярод не толькі дарослых, але і дзяцей. З дапамогай тэатра адбываецца ідэйны, а таксама эстэтычны ўплыў на любога чалавека, але на дзіця такі ўплыў вельмі вялікі.

Выхаванне мастацкага густу і фантазіі ў малодшых школьнікаў павінна адбывацца і праз гульню. Гульня з'яўляецца неад'емнай часткай жыццядзейнасці кожнага дзіцяці, яна дапамагае яму засвоіць неабходныя правілы, законы і маральныя нормы грамадства. Калі дзеці толькі пачынаюць гуляць у тую ці іншую гульню, у іх з'яўляюцца свае правілы, свой план, усё залежыць, наколькі развіта фантазія дзіцяці. Іграючы, дзіця, так ці інакш, капіруе дзеянні, словы, паводзіны бацькоў, любімых казачных персанажаў, старэйшых братоў і сясцёр. Гульня для дзяцей малодшага школьнага ўзросту блізкая з імправізаванымі тэатральнымі пастаноўкамі. «Малодшы школьнік падчас гульні можа пабываць у ролі акцёра, танцора, спевака, бізнесмена. Тэатральнае мастацтва блізка і зразумела дзецям, бо ў аснове тэатра ляжыць гульня» [1, с. 34].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тэатр спрыяе фарміраванню маральнай мадэлі паводзін у сучасным грамадстве, узбагачае культурнае жыццё малодшага школьніка, прывівае да духоўных каштоўнасцей, знаёміць вучня з дзіцячай літаратурай, музыкай, выяўленчым мастацтвам, правіламі этыкету, традыцыямі беларускага народа. Тэатралізаваная дзейнасць таксама развівае эмацыйную сферу дзіцяці. Малодшы школьнік вучыцца спагадаць і суперажываць персанажам, ставіць сябе на іх месца, а таксама ўнікаць у падзеі, што адлюстроўваюцца на сцэне. Шлях праз гульню, фантазію з'яўляецца самым эфектыўным і дзейсным для дасягнення мэт эмацыйнага разняволення дзіцяці.

Тэатральна-гульнёвая дзейнасць для дзяцей малодшага школьнага ўзросту вельмі разнастайная і рознабаковая. У ёй існуюць такія накірункі, як лялечны тэатр, пастаноўкі, эцюды, інсцэніроўкі і многае іншае. Усё гэта прываблівае дзяцей і аказвае дапамогу ў іх духоўна-маральным і эстэтычным развіцці.

У пачатку падрыхтоўкі да тэатралізаванага прадстаўлення ідзе фарміраванне вобраза на аснове літаратурнага твора, затым узбагачэнне, канкрэтызацыя вобраза ў прадукцыйнай форме; заканчваецца падрыхтоўка пераносам сродкаў вобразнасці з аднаго віду эстэтычнай дзейнасці ў іншую. Тэатралізаваная дзейнасць з'яўляецца адным з важных і даступных відаў дзейнасці для малодшых школьнікаў, падчас якой дзеці знаёмяцца са светам прыгожага, актывізуецца мысленне і ўвага, што спрыяе працэсу сацыялізацыі [2].

В. А. Сухамлінскі лічыў, што «тэатралізаваная дзейнасць з'яўляецца важнай крыніцай развіцця пачуццяў, перажыванняў і эмацыйных адкрыццяў дзіцяці, далучае яго да духоўнага багацця. Тэатральная пастаноўка прымушае хвалявацца, суперажываць персанажу і падзеям» [3, с. 24].

З тэатралізаванай дзейнасцю ўзаемазвязана і развіццё маўлення дзяцей. Падчас працы над выразнасцю рэплік персанажаў, уласных выказванняў актывізуецца слоўнік дзіцяці, удасканальваецца гукавая культура мовы вучня. Многія педагогі ў сваёй прафесійнай дзейнасці выкарыстоўваюць тэатралізацыю. Паступова малодшыя школьнікі далучаюцца да духоўна-маральных каштоўнасцей, культуры беларускага народа, мовы тытульнай нацыі. Пры дапамозе сумеснай падрыхтоўкі да спектакляў, рэпетыцый, расстаноўкі дэкарацый, радасці ад свайго ўдалага выканання ролі і выступу таварыша дзеці адчуваюць сябе членамі калектыву, бо школьнікі аб'яднаны ў сваёй дзейнасці адной агульнай мэтай. Дзеці, якія ўдзельнічаюць у тэатралізаванай дзейнасці, пазнаюць шмат новага, асабліва пра навакольны іх свет, які раскрываецца ва ўсёй разнастайнасці праз розныя гукі, вобразы, малюнкі, а выразна сфармуляваныя пытанні прымушаюць іх задумацца пра нешта важнае, штосьці прааналізаваць, а ўсё гэта спрыяе развіццю іх разумовых здольнасцей. Менавіта праз любоў да тэатра ў іх застаюцца толькі яркія ўспаміны свайго дзяцінства, якое выяўляецца ў адчуванні свята, праведзенага разам з бацькамі, педагогамі і аднагодкамі ў незвычайным чароўным свеце. Тэатр дае магчымасць для развіцця творчых здольнасцей, бо гэты від дзейнасці патрабуе ад дзяцей кемлівасці, увагі, арганізаванасці, хуткасці рэакцыі, умення дзейнічаць, падпарадкоўвацца пэўнаму вобразу, жыць яго жыццём [4].

Не трэба думаць пра тое, што ўсе дзеці жадаюць пабываць на сцэне, бо некаторым школьнікам больш падабаецца арганізоўваць розныя пастаноўкі, выконваць якія-небудзь даручэнні ці абавязкі. Многім вучням жадаецца пабываць на месцы сцэнарыста ці рэжысёра, а камусьці бліжэй быць дэкаратарам ці адказнымі за святло ці гук. Такая праца над арганізацыяй пастановак фарміруе ў дзяцей дысцыплінаванасць, акуратнасць, уменне знаходзіць выйсце з цяжкіх сітуацый. Дзеці набываюць досвед, прымаючы ўдзел ў тэатральных пастаноўках, падчас гэтага яны вучацца на сваіх памылках і на памылках сваіх таварышаў. Таму варта са школьнікамі ўвесь час падводзіць вынікі сваёй дзейнасці, да прыкладу, правесці гутарку, выслухаць меркаванне кожнага дзіцяці, што ў каго атрымалася лепш, чым на рэпетыцыях, а ў каго гэта атрымалася значна горш і над чым яшчэ трэба папрацаваць. Такая рэфлексія зможа дапамагчы дзіцяці зрабіць высновы пра сваю дзейнасць, паспрабаваць дапрацаваць яе.

У тэатралізаванай дзейнасці не заўсёды ўсё праходзіць на «удоўна». Часам узнікаюць такія моманты, калі падчас якога-небудзь выступу акцёр выходзіць на сцэну не своечасова (да прыкладу, не змог адшукаць свой касцюм) або ўзнікае паўза ў дыялогу (таму што партнёр запамятаў свае словы). Менавіта такія сітуацыі фарміруюць у дзяцей дысцыпліну і пачуццё адказнасці за сябе, а таксама за сваіх таварышаў. Сучасныя дзеці не прытрымліваюцца грамадскіх нормаў і правіл, якія старэйшае пакаленне імкнецца да школьнікаў данесці з дапамогай розных гутарак, таму такому дзіцяці бескарысна штосьці тлумачыць ці лаяцца на яго. Каб дамагчыся ўвагі дзяцей у прыняцці якіх-небудзь правіл ці нормаў, неабходна ўскласці на іх такую дзейнасць, якая іх зацікавіць, і тады вучні будуць з радасцю яе выконваць. «Самая эфектыўная дзейнасць, якая можа зацікавіць дзяцей – гэта гульня, таму тэатр будзе вельмі дзейсным сродкам, бо ён вельмі зблiжаны з гульнёй. Пры рэалізацыі задач дадзенай дзейнасці дзіця знаходзіць сілу волі, прымярае на сябе розныя ролі – "маскі", з гэтага зразумела, што дзіця вельмі перажывае і баіцца, што яго могуць пазбавіць гэтай адказнасці, таму ён спрабуе паказаць сябе з лепшага боку, каб яго дзейнасць ацанілі на вышэйшым узроўні. Дзякуючы ўласнаму досведу, дзіця стварае зусім новую, правільную мадэль паводзін і кіруецца ёю» [5, с. 586].

Падрыхтоўку дзяцей да ўспрымання тэатральнага спектакля магчыма ажыццяўляць непасрэдна падчас іх уласнай дзейнасці на ўроках, пры ўмове, што ў вучняў фарміруецца крытэрый ацэнкі гэтай дзейнасці. Але педагогу неабходна стварыць умовы для такой працы: выкарыстоўваць на занятках з дзецьмі эле-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

менты тэатральнага касцюма, рэквізіты, дэкарацыі, а таксама часцей выкарыстоўваць мультымедыйную апаратуру ці музычныя прылады.

Такім чынам, кожная казка ці літаратурны твор для дзяцей малодшага школьнага ўзросту заўсёды мае маральную скіраванасць, а з дапамогай тэатралізаванай дзейнасці ў дзяцей фарміруецца досвед сацыяльных навыкаў і паводзін. Дзіця выяўляе сваё ўласнае стаўленне да дабра і зла, спазнае свет не толькі розумам, але і сэрцам, і ўсё гэта дзякуючы тэатру. Дадзеная дзейнасць дапамагае пераадолець такія страхі, як няўпэўненасць у сабе, сарамлівасць і нясмеласць. Менавіта ў пачатковай школе тэатр навучыць дзіця знаходзіць у людзях і наогул у жыцці ўсё толькі прыгожае, а таксама сфарміруе імкненне быць па жыцці добрым, спагадлівым і цудоўным чалавекам, асобай. Каб даць дзіцяці развівацца ўсебакова, трэба навучаць яго тэатралізаванай дзейнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Ронами, Т. Ю. Театральная деятельность в начальной школе / Т. Ю. Ронами // Начальная школа. – 2009. – № 7. – С. 121–123.
2. Выготский, Л. С. Психология и искусство / Л. С. Выготский. – М. : Педагогика, 1987. – 347 с.
3. Кряжева, Н. Л. Мир детских эмоций / Н. Л. Кряжева. – Ярославль : Академия развития, 2000.
4. Театр – воспитание творчеством. Литературный материал по мотивам произведений классической и современной литературы : в 4 ч. / сост. Т. М. Кривко – Минск : НЦХТДМ, 2016. – Ч. 3. – 222 с.
5. Мянькоў, Ю. Школьны тэатр як глыток крынічнай вады / Ю. Мянькоў // Настаўніцкая газета. – 2017. – 3 чэрвеня. – С. 16.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова